общению с музыкой в том виде музыкальной деятельности, к которому он проявляет наибольший интерес, в котором его способности реализуются наиболее полно. Нужно принимать во внимание особенности каждого ребенка и соответственно им ориентировать процесс музыкального воспитания на развитие именно его способностей, склонностей, интересов. В противном случае, процесс обучения сводится к «натаскиванию». Если обучение осуществляется без индивидуально-дифференцированного подхода, она перестает быть развивающим.

1. Апраксина, О.А. Методика музыкального воспитания / О.А. Апраксина. – М. : Просвещение, 1983. – 222 с.

2. Ветлугина, Н.А. Музыкальное развитие ребенка / Н.А. Ветлугина. – М. : Искусство, 1999. – 415 с.

3. Тарасов, Г.С. Педагогика в системе музыкального образования / Г.С. Тарасов. – М. : Педагогика, 2006. – 488 с.

4. Эльконин, Д.Б. Психология игры / Д.Б. Эльконин. – М. : ВЛАДОС, 1999. – 360 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Арабей Д.С.,** студ. 112 гр.

Навуковы кіраўнік – Байко А.П.

## АРГАНІЗАЦЫЯ ФОРМ МІЖКУЛЬТУРНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ ЯК ІНСТРУМЕНТ РАЗВІЦЦЯ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ ЧЛЕНАЎ КЛУБАЎ ЮНЕСКА

Узаемадзеянне суправаджае чалавека ва ўсіх відах яго дзейнасці і здольна змяніць як стан псіхікі, так і паводзіны ў цэлым. Праз

інфармацыю, якую атрымлівае чалавек у працэсе ўзаемадзеяння, фарміруюцца спосабы дзейнасці, і праз перайманне, запазычанне, суперажыванне ўзбагачаюцца эмоцыі, пачуцці, звычкі, засвойваюцца новыя стэрэатыпы паводзін. Узаемадзеянне адыгрывае істотную ролю ў працэсе пазнання. У розных формах ўзаемадзеяння людзі абменьваюцца вынікамі пазнання розных аб'ектаў, авалодваюць вопытам, назапашаным іншымі людзьмі і пакаленнямі, а так сама пазнаюць сябе праз узаемадзеянне з іншымі ўдзельнікамі, фарміруючы розныя ўнутраныя і знешнія перакананні. Узаемадзеянне культур з'яўляецца складаным працэсам, у якім ўсталёўваюцца сувязі, працэсы культурнага абмену і зносін носяць перакрыжаваны характар [2].

Узаемадзеянне культур можа закончыцца чатырма варыянтамі выніку: 1) поўная асіміляцыя адной культуры другой (можа адбывацца толькі пры гвалтоўным знішчэнні адной культурай другой); 2) сінтэз – інтэграцыя і ўзаемны абмен элементаў культуры, у выніку якога адбываецца змены двух культур у плоць да ўтварэння новай культурнай супольнасці; 3) трансфармацыя – частковыя змены асобных бакоў, але без якаснай змены культур праз перабудаванне ўжо існуючых структур; 4) без запазычання – ніякіх зменаў не адбываецца, і кожная з культур працягвае развівацца, зыходзячы з уласнай культурнай мадэлі [1, с. 105]. В.В. Сафонава пад міжкультурным узаемадзеяннем разумее «функцыянальна абумоўленае камунікатыўнае ўзаемадзеянне людзей, якія выступаюць носьбітамі розных культурных супольнасцяў» [16, с. 20].

У сваім даследаванні мы вывучалі ключавыя сацыяльна-культурныя кампетэнцыі як міжкультурныя і міжгаліновыя веды, уменні і здольнасці, неабходныя для адаптацыі і плённай дзейнасці. Для працэсу міжкультурнага ўзаемадзеяння акрамя ведаў, уменняў і навыкаў, у рамках сацыяльна-культурных кампетэнцый неабходна сфармаваць кагнітыўныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

здольнасці, якасці асобы і формы паводзін. Важна разумець, як будуецца міжкультурная зносіны і ўзаемадзеянне, і што ўяўляюць клубы ЮНЕСКА.

Л.П. Мяркулава, І.А. Кірэева раскрываюць магчымыя віды зносін у працэсе міжкультурнага ўзаемадзеяння: афектыўна-ацэначны, рэкрэатыўны, перакананьны, рытуальны. Афектыўна-ацэначны від грунтуецца на станоўчых ці адмоўных пачуццях у дачыненні да іншага чалавека; і можа выяўляцца пры дапамозе этнічных стэрэатыпаў паводзін; забабонаў; абывацельскага меркавання, чутак. Рэкрэатыўны від уключае розныя формы забаўляльных зносін, у тым ліку конкурсы, спаборніцтвы, дыскусіі. Перакананьны від ўяўляе камунікацыю, накіраваную на стымуляванне якой-небудзь дзейнасці іншых людзей. Рытуальны від выяўляецца ў захаванні і выкананні сацыяльна устаноўленых норм і правілаў паводзін пэўнай культурнай групы [3].

Ўсякае культурнае ўражанне абавязкова патрабуе асэнсавання. Таму пры арганізацыі розных форм міжкультурнага ўзаемадзеяння ўжываецца сацыякультурны падыход, які дазваляе звязаць паняцці агульнай і/або нацыянальнай культуры з звычаямі сацыяльнай сферы, стэрэатыпамі паўсядзённага жыцця. Пры рэалізацыі дадзенага падыходу творча-пазнавальныя гутаркі ўключаць тэарэтычны блок, у ходзе рэалізацыі якога ўдзельнікі знаёмяцца з іншымі культурамі, і дыскусійны, калі ў свабодным абмене думкамі яны прыходзяць да адзінага разумення пэўнай катэгорыі. Творчае заданне мяркуецца для прымянення атрыманых вынікаў на практыцы. Напрыклад, у ходзе дыспуту арганізаванага ў клубе ЮНЕСКА «ДРУЖБА», які дзейнічае ў Гомельскім абласным Палацы творчасці дзяцей і моладзі «Юнацтва», удзельнікі ў пачатку выказвалі розныя меркаванні з нагоды прапанаванай для абмеркавання тэмы «Шляхі пабудовы міжкультурнага дыялогу», затым знаходзілі гэтыя шляхі вырашэння складаных камунікатыўных задач, доказна, аргументавана

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкладаючы свой пункт гледжання, захоўваючы вытрымку і спакой, з павагай ставячыся да апаненту. Тым самым удзельнікі дадзенага клуба рэалізуюць у жыцці адзін з прынцыпаў ЮНЕСКА, які абвяшчае, што ўсведамленне сваёй уласнай і іншых культур пашырае паразуменне паміж народамі і інфармаванасць аб агульных каштоўнасцях. Сумесная дзейнасць у клубах ЮНЕСКА дае магчымасць кожнаму паспрабаваць і даведацца, што ўяўляе міжкультурная камунікацыя і ўзаемадзеянне. За кошт гэтага асобныя кампетэнцыі як кампаненты сацыяльна-культурнай кампетэнтнасці фармуюцца паэтапна на працягу ўсіх гадоў сяброўства ў клубе ЮНЕСКА пасродкам усіх форм работы пры актыўным творчым ўдзеле ўсіх членаў. Сфарміраванасць асноў сацыяльна-культурнай кампетэнтнасці характарызуецца перцэпцыйнымі, эмпатыйнымі, камунікатыўнымі, рэфлексіўнымі, самапрэзэнтацыйнымі кампетэнцыямі, навыкамі менеджменту, валодання інфармацыйнымі тэхналогіямі, замежнымі мовамі. Каб фарміраваць кампетэнцыі пры рэалізацыі адной з задач па аднаўленні, захаванні і прапагандзе культурнага багацця сваёй нацыі і сусветнай супольнасці ў цэлым, клубы ЮНЕСКА:

- вывучаць культуру іншых краін шляхам арганізацыі гутарак, круглых сталоў, дыспутаў, лекцый, выстаў, абменаў, паказаў слайдаў, фільмаў, аўдыё і відэа праграм;

- клапаціцца аб захаванні сваёй культурнай спадчыны праз арганізацыю фальклорных экспедыцый, фальклорных гуртоў, гурткоў і секцый;

- удзельнічаць у правядзенні аднаўленчых і рэстаўрацыйных работ па захаванні помнікаў культуры;

- арганізоўваць пастаноўкі культурных і гістарычных паданняў пра розныя падзеі той ці іншай краіны, народа;

- праводзіць творчыя конкурсы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэалізацыя дадзеных формаў немагчымая без вывучэння замежных моў, як інструмента ўстанаўлення кантактаў паміж народамі. Таму да формаў арганізацыі міжкультурнага ўзаемадзеяння таксама адносяцца: секцыі па вывучэнню замежных моў; моўныя лагера, моўныя праграмы; абмены з мэтай удасканалення моўных навыкаў. Акрамя таго, любімай формай удзельнікаў клубаў ЮНЕСКА з'яўляюцца абмены паміж клубамі. Усе клубы арганізуюць паездкі, экскурсіі, падарожжа з мэтай даць іх удзельнікам, з аднаго боку, больш канкрэтныя веды эканамічных, сацыяльных і культурных рэалій, і, з другога боку, магчымасць лепш пазнаць сваіх суседзяў. Арганізуюцца і праводзяцца сумесныя акцыі з клубамі з іншых краін. Так у ліпені 2015 г. для мяжы трох дзяржаў – Рэспублікі Беларусь, Латвійскай Рэспублікі і Расійскай Федэрацыі быў арганізаваны XXIV міжнародны моладзевы лагер «Бе-La-Русь» (Курган Сяброўства, Верхнядзвінскі раён Віцебскай вобласці). Гэты лагер больш за дваццаць гадоў збірае прадстаўнікоў трох дзяржаў – Расіі, Беларусі і Латвіі ў паходных умовах. Сотні ўдзельнікаў – актыўная, творчая, спартыўная моладзь на працягу некалькіх дзён ладзяць зносіны, спаборнічаюць па розных відах спорту, прадстаўляюць свае краіны ў творчых конкурсах, знаёмяцца з культурай і традыцыямі братэрскіх народаў, абменьваюцца вопытам работы ў сферы маладзёжнай палітыкі.

Такім чынам, праблема цэласнасці фарміравання асобы грамадзяніна ў клубах ЮНЕСКА вырашаецца з дапамогай сумяшчэння тэарэтычнага матэрыялу, які неабходна засвоіць, з яго сінтэзам ў працэсе арганізацыі розных формаў міжкультурнага ўзаемадзеяння, а сфармаваныя сацыяльна-культурныя кампетэнцыі становяцца эфектыўным інструментам інтэграцыі. Аднак было б памылкай лічыць, што фарміраванне ў членаў клубаў ЮНЕСКА сацыяльна-культурнай кампетэнцый, як асновы кампетэнтнасці, азначае завяршэнне гэтага працэсу. На сучасным этапе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міжкультурная ўзаемадзеянне не толькі ўсё больш ўскладняецца, але і становіцца дзейсным сродкам, якія аказваюць уплыў на далейшае развіццё сацыяльна-культурных кампетэнцый.

---

1. Арутюнов, С.А. Народы и культуры. Развитие и взаимодействие / С.А. Арутюнов. – М. : Наука, 1989. – 247 с.

2. Дудович, Д.Л. Межкультурное взаимодействие как педагогическая проблема / Д.Л. Дудович // Вестник Самарского государственного технического университета. – №2 (16) – 2011 (3/11). – с. 35–43. – [Электронный ресурс]. Режим доступа : http://science.samgtu.ru. – Дата доступа : 02.03.2016.

3. Меркулова, Л.П. Компетенция межкультурного общения студенческой молодёжи: монография / Л.П. Меркулова, И.А. Киреева. – Самара : Изд-во СГАУ, 2011. – 196 с.

4. Республиканское общественное объединение «Белорусская Ассоциация клубов ЮНЕСКО» [электронный ресурс] – Режим доступа : www.belau.info. – Дата доступа : 02.2.2015.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Арабей.Д.С.,** студ. 112 гр.

Научный руководитель – Савина В.Ф.

## ЭТЮДЫ НА НАБЛЮДЕНИЕ КАК СРЕДСТВО РАСКРЫТИЯ ТВОРЧЕСКИХ СПОСОБНОСТЕЙ СТУДЕНТОВ НА ЗАНЯТИЯХ ПО РЕЖИССУРЕ КПД

«Этюд» имеет французское происхождение и переводится как «учение». Понятие «этюд» используется в живописи, музыке, шахматах и